Біблія для дзяцей

прадстаўляе

# Пачатак чалавечага смутку



Аўтар: Edward Hughes
Ілюстратар: Byron Unger; Lazarus
Адаптаваў: M. Maillot; Tammy S.
Пераклаў: Christian Lingua
Выдавец: Bible for Children
www.M1914.org

BFC
PO Box 3
Winnipeg, MB R3C 2G1
Canada

©2018 Bible for Children, Inc.
Ліцэнзія: Вы маеце права капіяваць ці друкаваць гэтую гісторыю,
але не ў камерцыйных мэтах (не прадаваць яе).

БОГ СТВАРЫЎ УСЁ! Калі Бог стварыў першага чалавека, Адама, той стаў жыць у Эдэмскім садзе разам са сваёй жонкай Евай. Яны былі абсалютна шчаслівыя, падпарадкоўваючыся Богу і атрымліваючы асалоду ад Яго прысутнасці – да аднаго дня ...





“Ці сказаў вам Бог
ня есці ад усялякага
дрэва?” – запытаў
змей Еву. “Мы можам
есці ад усялякага дрэва, акрамя
аднаго”, – адказала яна, – “Калі
мы з’ямо плод ад гэтага
дрэва ці нават кранёмся
яго, мы памром”.
“Вы не памраце...”
– ухмыльнуўся змей.



“Вы станеце як Бог”. Еве вельмі захацелася пакаштаваць. Яна паслухалася змея і з’ела плод.

Пасля таго, як Ева не паслухалася Бога, яна прывяла і Адама пакаштаваць плод.  Адам павінен быў сказаць: “Не!  Я буду слухацца Божага Слова”.





Калі Адам і Ева
зграшылі, яны абодва дазналіся,
што голыя. Каб пакрыць сябе, яны пашылі
фартухі з фігавага лісця. Потым яны
схаваліся ад Божай прысутнасці ў кустах.

Падчас вячэрняй прахалоды Бог прыйшоў у сад. Ён ведаў, што зрабілі Адам і Ева. Адам абвінаваціў Еву. Ева абвінаваціла змея. Бог сказаў: “Змей пракляты. А жанчына будзе адчуваць боль падчас нараджэння дзяцей”.



“Адам, зямля будзе праклятая з-за таго, што вы зграшылі. Яна пакрыецца шыпамі і чартапалохам. Ты будзеш цяжка працаваць і пацець, каб атрымаць ежу на дзень”.





Бог выдаліў Адама і Еву з цудоўнага саду. З-за свайго граху яны разлучыліся з Богам, які дае жыцця! Бог стварыў агністы меч, каб трымаць іх найдалей ад саду. Таксама Бог стварыў скуранае адзенне для Адама і Евы. Але адкуль Бог узяў скуру для яго?

З цягам часу ў Адама і Евы нарадзілася сям'я. Каін, іх першы сын, вырошчваў расліны. Авель, іх другі сын, быў пастухом. Аднойчы Каін прынёс Богу ў падарунак сваю гародніну. Авель, у сваю чаргу, падараваў Богу самых лепшых сваіх авечак. Бог быў задаволены падарункам Авеля.



Бог не быў задаволены падарункам Каіна. Тады Каін вельмі раззлаваўся. Але Бог сказаў: “Калі ты робіш тое, што правільна, ці не будзеш прыняты?”



Аднак гнеў Каіна не сыходзіў. Праз некаторы час ён напаў на Авеля ў полі – і забіў яго!



Бог сказаў Каіну: “Дзе брат твой, Авель?” “Я не ведаю” – схлусіў Каін, – “хіба я вартаўнік майму брату?” Бог пакараў Каіна, пазбавіўшы яго магчымасці вырошчваць гародніну, і зрабіў яго вандроўнікам.



Каін выйшаў з прысутнасці Госпада. Ён ажаніўся з дачкой Адама і Евы, і яны стварылі сям'ю.  Неўзабаве, унукі і праўнукі Каіна запоўнілі заснаваны ім горад.



Між тым, сям'я Адама і Евы таксама хутка расла.  У тыя часы людзі жылі значна даўжэй, чым сёння.



Калі ў Евы нарадзіўся сын Сіф, яна сказала, “Бог даў мне Сіфа замест Авеля”. Сіф быў набожным чалавекам, ён пражыў 912 гадоў і меў шмат дзяцей.



Людзі ў свеце рабіліся ўсё больш і больш злыя, пакаленне за пакаленнем.  Урэшце, Бог вырашыў знішчыць чалавецтва ...



... а таксама ўсіх звяроў і птушак. Бог пашкадаваў, што стварыў людзей. Але адзін чалавек дагадзіў Богу ...





Гэтага чалавека звалі Ной, ён быў нашчадкам Сіфа. Ной быў праведны і беззаганны чалавек.

Ён слухаўся Бога.

Ён таксама навучыў трох сваіх
сыноў быць паслухмянымі Богу.
Цяпер Бог планаваў выкарыстаць
Ноя вельмі дзіўным і
адмысловым
чынам!



Пачатак чалавечага смутку

Гісторыя з Божага Слова, Бібліі

знаходзіцца ў

Быццё 3-6

“Сведчанне словаў Тваіх прасвятляе.”
Псалтыр 119:130

Канец

Гэтая Біблейская гісторыя распавядае нам пра цудоўнага Бога, Які стварыў нас, і хоча, каб вы ведалі Яго.

Бог ведае, што мы рабілі дрэнныя справы, якія Ён называе грахом.  Пакаранне за грэх ёсць смерць, але Бог любіць вас так моцна, што Ён паслаў Свайго адзінага Сына, Ісуса, памерці на крыжы і панесці пакаранне за вашыя грахі.  Потым Ісус уваскрэс з мёртвых і вярнуўся дадому, на нябёсы!  Калі вы паверыце ў Ісуса і папросіце Яго прабачыць вашыя грахі, Ён зробіць гэта!  Ён прыйдзе і цяпер будзе жыць унутры вас, а вы будзеце жыць з Ім вечна.

Калі вы верыце, што гэта праўдзіва, скажыце Богу наступнае: Дарагі Ісус, я веру, што Ты Бог і стаў чалавекам, каб памерці за мае грахі, і цяпер Ты зноў жывы.  Калі ласка, увайдзі ў маё жыццё і прабач мае грахі, каб я мог мець новае жыццё цяпер, і аднойчы прыйсці да Цябе, каб быць з Табой назаўжды.  Дапамажы мне слухацца Цябе і жыць для Цябе, як Тваё дзіцё.  Амін.

Чытай Біблію і размаўляй з Богам кожны дзень!   Ян 3:16